УДК 882.6-1

**В.В. Лапацінская**

# Ідэйна-мастацкая функцыя тропаў у творчасці Анатоля Сербантовіча (на прыкладзе метафары)

І ў нашыя дні пытанні паэтыкі з'яўляюцца прыярытэтнымі ў айчынным літаратуразнаўстве. Гэта абумоўлена, у першую чаргу, яго скіраванасцю на даследаванне праблем змястоўнасці мастацкага слова, яго сувязі з грамадскім жыццём, ідэйна-філасофскай значнасці і г.д., а не форматворчасці, жанравародавай і вобразнай спецыфікі. Адсюль і параўнальна слабая распрацаванасць паэтыкі тропаў, паэтычнага сінтаксісу, пытанняў верша ў цэлым.

Мэта нашага даследавання – стыль А. Сербантовіча, яго эвалюцыя ў працэсе мастацкай самаідэнтыфікацыі аўтара ва ўмовах дыскрэтнага часу, што нясе на сабе адбітак рамантычна-ўзнёслага настрою, а затым яго спаду. Тропы ў сістэме, комплексна, таксама ў многім вызначаюць стылявую, жанравую адметнасць творчасці мастака слова, літаратурнай школы і нават літаратурнага напрамку. Таму, здаецца, прыватная праблема частотнасці іх ужывання дае магчымасць прыйсці да правільных вывадаў шляхам індукцыі, зрабіць нечаканыя адкрыцці. Асабліва плённа элементамі статыстычнага аналізу карысталіся структуралісты 20-х і пазнейшых гадоў XX ст. Найбольш паказальныя набыткі ў гэтым плане мае школа Ю.М. Лотмана [1].

Метафара з'яўляецца адным з самых распаўсюджаных тропаў у паэтычнай мове. Яе генезіс, эстэтычную функцыянальнасць раскрывалі вядомыя філосафы і мысляры – Арыстоцель, Русо, Гегель, Э. Касірэр, Х. Артэга-і-Гасет і многія іншыя. Падобная ўвага абумоўлена ў першую чаргу тым, што метафара – гэта «ключ да разумення асноваў мыслення і працэсаў стварэння не толькі нацыянальна-спецыфічнага бачання свету, але і яго універсальнага вобразу» [2]. Вывучэннем прыроды метафары і законаў метафарызацыі дастаткова плённа і вынікова займаліся такія вядомыя вучоныя-лінгвісты, як А.А. Патабня, Ф.І. Буслаеў. На сучасным этапе праведзена грунтоўная праца па асэнсаванні двухпланавай сутнасці метафары (даследаванні Г.М. Паспелава, А.І. Яфімава, В.У. Вінаградава і інш.), выяўлены накірункі аналізу метафарычнай вобразнай творчасці асобных пісьменнікаў.

Як заўважаюць замежныя тэарэтыкі літаратуры А. Уорэн і Р. Уэллек, «менавіта – і перш за ўсё – у метафары і міфе выяўляецца прызначэнне і функцыя літаратуры. Сфера духоўнай дзейнасці чалавека ўключае метафарычнае і міфічнае мысленне, гэта значыць мысленне метафарамі і мысленне ў форме паэтычнага апавядання, бачання» [3]. Такім чынам, літаратуразнаўцы схіляюцца да думкі, што менавіта метафарычнасць з'яўляецца асновай вобразатворчасці і адлюстроўвае рысы індывідуальнага светабачання кожнага мастака слова, у многім становіцца стылетворным фактарам, вызначае індывідуальную адметнасць творчасці пісьменніка.

За аснову падліку ў нашым даследаванні мы ўзялі крытэрый падзелу метафар на групы: з аднаго боку, рамантычныя і рэалістычныя, з другога – аўтарскія і традыцыйныя (у тым ліку фальклорныя, прасачылі гэту тэндэнцыю асобна на прыкладах з трох зборнікаў паэта, і прыйшлі да наступных вывадаў.

У першай кнізе «Азбука» (гл. табліцу) Анатолем Сербантовічам выкарыстана ў працэнтных адносінах: рамантычных метафар – 27,94%, рэалістычных – 11,76%, аўтарскіх – 29,41%, традыцыйных (у тым ліку фальклорных) – 30,98%.

Табліца

**Метафары (зб. «Азбука»)**

| № | Рамантычныя | Рэалістычныя | Аўтарскія | Традыцыйныя (у тым ліку фальклорныя) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1. | У сэрца стукаецца май | Трактар, не спяшаючы, паўзе | Чупрынай рыжаю травінак лугі ўспыхнулі | Сэрца тропнула нясмела |
| 2. | [Дарога] пад коламі ўскрыквае | Гарачая яечня са стала угледзіцца лупатымі вачыма | Лаза спяшае хусткі павуцінак, нібы бабулька, павязаць | [Дарога] падкована асфальтам |
| 3. | Вада заўсёды мілуе | Ліпы больш не чахнуць | Яны людзей курылі [крэматорыі] | Распусціла мяцеліца косы (*фалькл.*) |
| 4. | У згодзе з ім жыве рака сама | Маленства пахне лісцямі і ранняю травой | Карагоды вадзілі лісы, танцавалі ў кругуваўкі | Будуць зоры цвісці |
| 5. | Біла крыламі лісце | Сумленне маці не пячэ | Успаміны просяцца і колюцца | Трава яшчэ хавала |
| 6. | У сумётах сумуе восень | Жыла нястача ў хатах | Трава за ногі ворага чапляецца | Вада выкідвала назад |
| 7. | У сэрца крадзецца адчай | Прабуе голас за ракой гудок | Ляжалі ў арыштанцкім халаце палі | Гуляе вецер золкі (*фалькл.*) |
| 8. | Пырснуць росаў дажджы | Сюды не далятала рэха колаў | Акулы пад канвоем к берагу вялі | Слупы бягуць, хістаюцца |
| 9. | Трубіла хмара ў чорны рог | — | Пустое «ўра» нікога не парадуе | Хвалюецца ля берага лаза (*фалькл.*) |
| 10. | Стрэлы ўспыхнулі | — | Чайкі крыламі хвалі косяць | Вятры ў полі карагоды водзяць (*фалькл.*) |
| 11. | Як жывыя, уночы размаўляюць званы | — | Покуль плавіцца ранак | Вятры ўсё снягі змятаюць |
| 12. | Нада мною гавораць, // патрабуюць званы | — | Клюнула корань тупая лапата | Аж покуль не зазвоняць ручаі (*фалькл.*) |
| 13. | І поры года на пасты выходзяць | — | Час над ёй [зямлёй] схіліўся | На вадапой спусціліся вярбіны |
| 14. | Ручаі, узяўшыя мароз і снег у шпагі | — | Гарбуз у агародзе пад галаву паклаў грады рабрыну | Шумяць сасна і дуб-асілак (*фалькл.*) |

Працяг табліцы

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| 15. | А сад, як слёзы, лісце долу скінуў | — | На касмадроме полюса зіма рыхтуецца выходзіць на арбіту | Пацягнецца заспаная зямля |
| 16. | Дрыжыць разгублена гарлачык | — | Клавішы зямлі перабіраюць пальцы касцяныя жалудоў | Вятры тады ў полі гулі (*фалькл.*) |
| 17. | Трыццаць год узляцела з твайго пляча | — | Вецер коціцца за сяло | З гадамі прыходзіць розум, // З гадамі трывожыць роздум |
| 18. | Усходзіць серабрыстая сівізна | — | Палотны туманоў лашчыны сцягнуць | Мой час гадзіннік на сцяне адстуквае |
| 19. | Ноч яго ў сваім нябачным чоўне // На далёкі бераг адвязла | — | Драты дажджу вісяць, электразваркай плешчуцца | Прасілі ў нас ліпы літасці |
| 20. | — | — | І хмара, быццам леў, трасе калматай грываю | Вятры тады хату мялі |
| 21. | — | — | — | [Былое] Яно пасля цячэ ў крыві // жыве таемна ў сэрцы |

Трэба заўважыць, што аўтарскія тропы пераважна рамантычна афарбаваны. Такім чынам, рамантычныя стылявыя прыкметы (паводле выкарыстаных паэтам метафар) маюць перавагу над рэалістычнымі: 39 рамантычных тропаў (у суме з аўтарскімі) суадносяцца з 29 рэалістычнымі (у суме з традыцыйнымі).

Другі зборнік Анатоля Сербантовіча стаў працягам стылявых пошукаў «Азбукі». Мастак слова самасцвярджаецца ў ім як прыхільнік «сінтэтычнага» стылю: паэтам выкарыстоўваюцца рэалістычныя і рамантычныя метафары, але з яўнай перавагай апошніх.

Дадзеныя падліку частотнасці выкарыстання розных відаў метафар у другім зборніку выглядаюць наступным чынам: рамантычныя тропы складаюць 29,03% ад агульнай колькасці, рэалістычныя – 17,74%, аўтарскія – 40,32%, традыцыйныя (у тым ліку фальклорныя) – 12,9%. Сумiраванне колькасці рэалістычных і традыцыйных (блізкіх да іх) метафар дае лічбу – 30,64%, а рамантычных і аўтарскіх – 69,62%. Такім чынам, мы атрымалі неабвержнае статыстычнае падцвярджэнне выказанай думкі, што стыль Анатоля Сербантовіча паводле выкарыстання метафар з'яўляецца «сінтэтычным» з перавагай рамантычных стылявых адзнак: 69,62% рамантычнай тропікі спалучаюцца з 30,64% рэалістычнай.

Трэба адзначыць, што большасць метафар мастака слова – тропы складаныя, «узмоцненыя» эпітэтамі і параўнаннямі, працэнтныя дадзеныя аўтарскіх метафар у параўнанні з першым зборнікам павялічыліся (з 29,41% да 40,32%), што, безумоўна, сведчыць пра ўзрослае паэтычнае майстэрства паэта.

У зборніку «Пярсцёнак» 37 рамантычных, 27 рэалістычных, 44 аўтарскіх і 16 традыцыйных (у тым ліку фальклорных) метафар. У працэнтных адносінах: рамантычных метафар – 29,83%, рэалістычных – 21,77%, аўтарскіх – 35,48%, традыцыйных – 12,9%, што сведчыць пра далейшы рост майстэрства Анатоля

Сербантовіча, адметнасць і непаўторнасць яго стылю, аўтарскай метафарычнай карціны свету.

Статыстычны аналіз дае магчымасць выявіць асноўныя заканамернасці па трох зборніках паэта, якія графічна можна прадставіць у выглядзе дыяграмы.

Дыяграма

**Зборнік «Азбука»**

| | |
|---|---|
| Рамантычныя + аўтарскія метафары | 39 |
| Рэалістычныя + традыцыйныя метафары | 29 |




**Зборнік «Мінная поле»**

| | |
|---|---|
| Рамантычныя + аўтарскія метафары | 43 |
| Рэалістычныя + традыцыйныя метафары | 19 |



**Зборнік «Пярсцёнак»**

| | |
|---|---|
| Рамантычныя + аўтарскія метафары | 81 |
| Рэалістычныя + традыцыйныя метафары | 43 |




Статыстычныя дадзеныя ў цэлым сведчаць пра тое, што Анатоль Сербантовіч адлюстроўваў пераважна рамантычны пафас эпохі.

Шмат аўтарскіх тропаў з'явілася ў яго творчасці ў перыяд навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (НТР) у выніку прыўнясення рыс новага, «тэхнізаванага» светаўспрымання ў сферу будзённага жыцця, у новае, глыбейшае разуменне законаў прыроды, навакольнага асяроддзя. Так, напрыклад, зіма не толькі выклікае ў паэта шчымлівае замілаванне, але і моцнае пачуццё павагі і захаплення ёю, якое не знікае нават пад націскам тэхнікі, а таму яна малюецца як велічная з'ява, гіпербалічна. Яе прыход паказваецца з дапамогай касмічнага вобраза: «На касмадроме полюса зіма рыхтуецца выходзіць на арбіту» [4].

«Звышзахапленне» прыродай нараджае нечаканы, незвычайны аўтарскі асацыятыўны троп, паводле якога, напрыклад, побач ставяцца дождж і электрычнасць: «Драты дажджу вісяць, электразваркай плешчуцца» [4]. Падобныя прыклады аўтарскіх метафар праліваюць «святло на псіхалогію творчасці» [2]. Троп у дадзеным выпадку, падобна фрэскавай выяве, вырастае ў вобраз-рэалію, якая ператвараецца ў яскравую карціну жыцця, знаёміць нас з адчуваннямі, успрыманнямі рэчаіснасці і ўяўленнямі пра іх чалавека 1960-х гадоў, які, дзякуючы навукова-тэхнічным дасягненням і грамадскай атмасферы «адлігі», ды рамантычнай узнёсласці адчуў сваю значнасць, паставіў сябе ў цэнтр Сусвету.

Невялікая колькасць фальклорных метафар у творчасці паэта ў цэлым сведчыць пра прыналежнасць паэта да творчай плеяды філалагічнага пакалення, адной (хаця і не ўсеагульнай, калі ўлічыць своеасаблівасць пошукаў Р. Барадуліна) з адметнасцей творчасці якога была зарыентаванасць на пераадоленне фальклорнай традыцыі. Гэтая тэндэнцыя асабліва ярка праявілася ў паэзіі Анатоля Сербантовіча, у большай ступені, чым, напрыклад, у творчасці А. Русака, А. Астрэйкі, А. Вялюгіна, А. Бялевіча і некаторых іншых паэтаў ваеннага пакалення, якія знаходзіліся пад непасрэдным уплывам вуснай народнай творчасці, «эксплуатавалі» яе матывы і слоўна-выяўленчыя сродкі. Менавіта ў гэтым мы бачым важкую прычыну з'яўлення вялікай колькасці аўтарскіх тропаў і – адпаведна – росту таленавітасці аўтара, для

якога фальклор быў толькі першай прыступкай творчага сталення на шляху авалодання кніжна-літаратурнай традыцыяй сусветнага слоўнага мастацтва.

Шмат асацыяцый і параўнанняў, якія пакладзены ў аснову сербантовічаўскіх аўтарскіх метафар, маюць свае вытокі ў літаратуры Сярэбранага веку, заснаваны на пераламленні і пераасэнсаванні традыцый імажынізму, асабліва яго праяў у творчасці С. Ясеніна, ранняга Б. Пастэрнака, Т. Кляшторнага.

У 30-я гады мінулага стагоддзя смелая вобразнасць Тодара Кляшторнага («ледзяныя гітары», «вішнёвыя хмары», «ружовыя келіхі» і т.п.) стала «мастакоўскім сцверджаннем права на асабістыя перажыванні ў паэзіі, на бачанне «вывіхаў людзей», якія ў сваім роздуме аб жыцці не задавальняюцца наборам ідэалагічных штампаў» [5]. Так і аўтарскія метафары Анатоля Сербантовіча сведчылі ў 60-я гады XX ст. пра нетрадыцыйнасць аўтарскага светабачання, адлюстроўвалі яшчэ адну тэндэнцыю тагачаснага літаратурнага працэсу – прагу абнаўлення і актыўнага пераадолення дагматызму, ілюстрацыйнасці і спрошчанасці ў паказе рэчаіснасці, імкненне да наватарскіх пошукаў у галіне мастацкай формы. Метафара звычайна выяўляе самабытнасць творчай манеры пісьма, аўтарскага стылю, бо, як ні адзін іншы троп, менавіта яна аказваецца здольная да стварэння адначасова прадметнага, асацыятыўнага і пластычнага малюнка, бо «ў ёй заключана імпліцытнае супрацьпастаўленне будзённага бачання свету, якое суадносіцца з класіфікуючымі (таксанамічнымі) прэдыкатамі, незвычайнаму, якое ўскрывае індывідную сутнасць прадмета» [3].

У пацвярджэнне выказанай думкі звернемся да верша *«Шаша ныраe ў гул і грукат...»*. Метафара ў ім не толькі стварае яскравы пейзажны малюнак, але і вызначае час дзеяння, яго развіццё ў прасторы. Дзякуючы гэтай «універсальнасці» тропа, вобразная карціна становіцца зрокавай, прадметнай і адначасова маштабна-асацыятыўнай:

*Шаша ныраe ў гул і грукат,*
*У накрапы рэдзенькіх слупоў, —*
*Цыгарку вёрст бярэ ў рукі,*
*Пускае ў вочы дым снягоў* [4].

Як бачым, вобразная думка тут вельмі ёмістая, лаканічная, можа, дзякуючы гэтаму ў адной страфе Анатоль Сербантовіч спалучыў афарыстычнае апісанне, якое ў празаічным варыянце сталася б разгорнутай пейзажнай замалёўкай, і асацыятыўнасць, у аснове якой нешаблоннае параўнанне, кожны кампанент якога трывала замацаваўся ў сэнсавым кантэксце і не можа быць заменены іншым. Асацыяцыі тыпу – параўнанне смугі, туману з дымам цыгарэт – даволі часта сустракаюцца ў паэзіі Сяргея Ясеніна: «задымился вечер», «курятся туманы», «курит облаком болото» і т.п. Аднак вобраз шашы, якая курыць «цыгарку вёрст» і «пускае ў вочы дым снягоў» – гэта наватарскі троп, які ў беларускай літаратуры ўпершыню створаны Анатолем Сербантовічам і, на нашу думку, не паўтораны, не дапоўнены і не разгорнуты нікім з беларускіх майстроў.

Да ліку аўтарскіх тропаў, якія палягаюць у рэчышчы традыцый Сярэбранага веку і паэзіі С. Ясеніна і ранняга Б. Пастэрнака, безумоўна, трэба аднесці і наступны: «Цыбатае сонца на ворыве чорным // Клякоча, як бусел, — пяе для жывых, // І робіць такое, за што яшчэ ўчора, // Відаць, не знасіла б сваёй галавы» [4] (верш *«То мора, то бераг, то востраў зялёны...»* са зборніка «Пярсцёнак»). Гэты троп выступае своеасаблівым цэнтрам ідэйнага прыцягнення, вакол якога канцэнтруецца сэнсавымі кольцамі творчая задума ўсяго верша. Сонца – традыцыйны сімвал жыцця – ператвараецца ў шматгранны вобраз-сімвал: яно не толькі «пяе для жывых», адорваючы іх цеплынёй і ласкай, але і дае самую светлую надзею (што ўдала

падкрэсліваецца параўнаннем яго з буслом). Менавіта падобнае смелае і ў нечым «нахабнае» свяціла (падобнае сваёй безразважнасцю да ясенінскага сонейка, што звесіла ногі на пагорак, калі шукала месяц) з'яўляецца мяжой паміж учора, калі лірычны герой твора «стаяў на абрыве, // Балючы і калючы – у стрэлах дажджу» [4], і сёння, калі ён ужо зрабіўся вясёлым, шчаслівым і новым. Падобны троп сустракаецца ў Р. Барадуліна, калі паэт стварае вобраз восені, якая цыбатай жураўлінаю нагой крочыць імшарамі. Адносна ж вобраза сонца мы схільныя гаварыць пра наватарства А. Сербантовіча, якое заключаецца ў імкненні сканцэнтраваць думку ў дадзеным, як і многіх іншых, тропах, надаць яму зместавую шматзначнасць. У «Пярсцёнку» даволі шмат аўтарскіх і рамантычных метафар выкарыстана мастаком слова ў вершах пра Сібір, тайгу – экзатычны край. Тут паэт выявіў сябе пераемнікам традыцыі, закладзенай Алесем Гаруном.

Яшчэ адной заканамернасцю, выяўленай падчас аналізу, з'яўляецца паступовае змяншэнне агульнай колькасці метафар. Так, у першым зборніку іх доля складае 70 выпадкаў у 58 творах (120,68%), у другім – 62 з 80 (77,50%), у трэцім – 124 са 156 (за асобныя творы былі палічаны кожны санет з 3-х вянкоў санетаў) (79,48%). На нашу думку, гэты факт сведчыць пра ўзрастанне філасафічнасці ў лірыцы Анатоля Сербантовіча, што ў сваю чаргу вымушала яго пазбаўляцца апісальнасці, напышлівага рытарызму, «квяцістасці» пісьма, замененых слоўнай ашчаднасцю, разважлівасцю, медытатыўнасцю. Такім чынам, калі зборнік «Азбука» Анатоля Сербантовіча па стылёвым афармленні (выкарыстанне тропаў) быў блізкі да стылю ранніх зборнікаў Рыгора Барадуліна «Маладзік над стэпам», «Рунець, красавацъ, налівацца!» выяўленча-апісальным характарам стылю, функцыяй тропаў, то стыль «Пярсцёнка» ўжо набліжаецца па сваіх асноўных адзнаках да стылю паэзіі думкі Анатоля Вярцінскага. Але адзначым адначасова, што паміж стылямі двух аўтараў ёсць і істотнае адрозненне: Анатоль Сербантовіч пазбягае адкрытай норавaапісальнасці, дыдактычнай павучальнасці, яго пісьмо больш яркае, метафарычнае, эмацыянальна-імпульсіўнае.

Такім чынам, ад «Азбукі» да «Пярсцёнка» стыль Анатоля Сербантовіча відавочна мяняўся: станавіўся ўсё больш гарманізаваным, «сінкрэтычным», у ім спалучаліся рамантычныя і рэалістычныя прынцыпы пісьма пры відавочнай перавазе першых, паступова ўзрастала роля адметнага аўтарскага тропа, слова, выразу.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Лотман Ю.*** Структура художественного текста. – М., 1970. – 384 с.
2. ***Теория метафоры***: Сборник / Перевод с англ., франц., нем., исп., польск. языков / Вступит. ст. и сост. ***Н.Д. Арутюновой***; общ. ред. ***Н.Д. Арутюновой, М.А. Жирмунской***. – М., 1990. – С. 6.
3. ***Уэллек Р., Уоррен О.*** Теория литературы. – М., 1978. – 326 с.
4. ***Сербантовіч А.*** Жаваранак у зеніце: Вершы. – Мн., 1989. – 478 с.
5. ***Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.*** У 4 т. Т. 2 /. Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мн., 1999. – С. 34.



*S U M M A R Y*

*The article is devoted to the problem of tropes poetics in the works by A. Serbantovich. Due to the metaphors used by the author, his style is described as syncretic, romantic based on realistic principles, and possesses some peculiar features.*


*Поступила в редакцию 30.09.2004*